СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМІ

Прачытай і перадай другому

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

№ 60

Верасень 1942 г.

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі.

СОВЕЦКІ УРАД УДАСТОІЎ ВЫСОКАГА ЗВАННЯ ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА 9 ПАРТЫЗАН І ЎЗНАГАРОДЗІЎ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СОВЕЦКАГА САЮЗА 1.018 ПАРТЫЗАН.

ЧЭСЦЬ І СЛАВА НАРОДНЫМ МСЦІЎЦАМ, ЯКІЯ ГЕРАІЧНА ЗМАГАЮЦЦА З ПРАКЛЯТЫМІ НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ!

## СЛАЎНЫЯ ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! НЕ ШКАДАВАЦЬ ПАТРОНАЎ СУПРОЦЬ ФАШЫСТАЎ!

### ПА ЗАСЛУГАХ НЯМЕЦКАМУ ЗБРОДУ ПАРТЫЗАНЫ ДАЛІ „ЎЗНАГАРОДУ“



АБОЗЫ, ВАРОЖЫЯ ТАНКІ,
МАШЫНЫ, З КРЫЖОМ ПАРАВОЗ
АД МСЦІВАЙ РУКІ ПАРТЫЗАНСКАЙ
ЛЯЦЯЦЬ СТРЫМГАЛОЎ ПАД АДКОС.

ТО ВОЛЯ, ТО ШЧАСЦЕ НАРОДА
СЫНАМ СВАІМ ДУЖАСЦЬ ДАЛІ.
НА СМЕРЦЬ ЗА ЖЫЦЦЕ Ў ПАХОДЫ
АДВАЖНЫЯ МСЦІЎЦЫ ПАЙШЛІ.

### І ЗА ГЭТА МСЦІЎЦЫ НАРОДНЫЯ ПА ЗАСЛУГАХ УЗНАГАРОДЖАНЫ



ВЫШЭЙШАЙ НЯМА ЎЗНАГАРОДЫ
ГЕРОЯМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ,
ЯК ЧЭСЦЬ І ЛЮБОЎ АД НАРОДА,
АД РОДНАЙ СВАЕЙ СТАРАНЫ.

І ОРДЭН, ЯК ЗНАК ШАНАВАННЯ
ЗА ЦЯЖКІ ЗА ПРОЙДЗЕНЫ ШЛЯХ
ЗА ЛЮТАЕ З НЕМЦАМ ЗМАГАННЕ
КРАСУЕ Ў БАЙЦА НА ГРУДЗЯХ.

# ПАРТЫЗАНЫ! МАЦНЕЙ УДАРЫ ПА ВОРАГУ!

НАПЕРАД, АРЛЫ-ПАРТЫЗАНЫ,
ГЕРОІ, НАРОДНЫЯ МСЦІЎЦЫ,
ЗНІШЧАЙЦЕ ФАШЫСТАЎ ПАГАНЫХ,
АГНЁМ КУЛЯМЁТНЫМ КАСІЦЕ!

ХАЙ БУДЗЕ ЗЯМЛЯ ЎСЯ ПАГОСТАМ
ДЛЯ НАВАЛАЧЫ ІХ ПРАКЛЯТАЙ,
А ГНЕЎ І НАРОДНАЯ ПОМСТА
ГРЫМІЦЬ У РАЗРЫВАХ ГРАНАТАЎ.

ЯШЧЭ ПАПЯЛІШЧЫ ПАД ДЫМАМ,
АЛЕ ПАДЫМАЕЦЦА СОНЦА.
НА СТРАЖЫ ПРАСТОРАЎ РАДЗІМЫ
НЯСТОМНА, АДВАЖНЫЯ, СТОЙЦЕ!

ЯК ВОЛЬНАЯ ПЕСНЯ НАД КРАЕМ
ПА СЦЕЖКАХ, ПАЛЁХ І ДУБРАВАХ,
У ЗМАГАННІ РАСЦІ БАЯВАЯ,
ГРЫМІ, ПАРТЫЗАНСКАЯ СЛАВА!

## УКАЗ
### Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

**АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯ ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА ПАРТЫЗАНАМ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ Ў ПАРТЫЗАНСКАЙ БАРАЦЬБЕ Ў ТЫЛУ СУПРОЦЬ НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ**

За адвагу і геройства, праяўленыя ў партызанскай барацьбе ў тылу супроць нямецкіх захопнікаў, прысвоіць званне Героя Совецкага Саюза з *уручэннем ордэна Леніна* і медалі «Залатая звязда»:

1. **Бандарэнка** Аляксею Дзімітрыевічу.
2. **Дука** Міхаілу Ільічу.
3. **Емлюціну** Дзімітрыю Васільевічу.
4. **Іжукіну** Аляксею Іванавічу.
5. **Казлову** Васілію Іванавічу.
6. **Курыленка** Владзіміру Цімафеевічу.
7. **Рамашыну** Міхаілу Пятровічу.
8. **Рабок** Владзіміру Самсонавічу.
9. **Стрэлец** Філіпу Еўдакімавічу.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль, 1 верасня 1942 г.

—★—

## УЗНАГАРОДЖАННЕ ПАРТЫЗАН

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 1 верасня 1942 года за доблесць і мужнасць, праяўленыя ў партызанскай барацьбе ў тылу супроць нямецкіх захопнікаў, узнагароджаны ордэнамі і медалямі 1,018 партызан Украіны, Беларусі, Арлоўскай і Смаленскай абласцей.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны 48 чалавек, ордэнам Чырвонага Сцягу — 176 чалавек, ордэнам Чырвонай Звязды — 305 чалавек, ордэнам «Знак почета» — 72 чалавекі, медалю «За адвагу» — 240 чалавек і медаллю «За баявыя заслугі» — 177 чалавек.



**Ехалі фрыцы
На рускі фронт
Дабром пажывіцца,
Набіць жывот.**

**Ехалі, пелі
Пад звон калёс, —
Аж паляцелі
Пад адкос!**



**Прэцца штабная
На фронт машына
З новым загадам
Ката з Берліна:**

**«Народ прымусіць
Плаціць падатак,
На Беларусі
Зрабіць парадак...»**

**На павароце
Па абармотах
Засакаталі
Два кулямёты.**

**Два кулямёты
Бацькі Міная,**

**Кожная куля
У немца трапляе.**

**Кожная куля
Смерцю ім свішча
За наша гора,
За папялішча.**

**Вось ад народа,
Чорныя гады,
Вам і падаткі,
Вам і загады!**

**Ад партызанскіх
Куляў і гневу
Не ўцячы,
Не скрыцца нідзе вам.**

Якуб КОЛАС

## БАЦЬКУ МІНАЮ

**Паклон табе шчыры і нізкі,
Наш бацька Мінай!
Ты стаўся нам родны і блізкі:
Ты — гэта наш край,
Прываблівы, мудры і скромны
І стойкі, як дуб,
Той дуб-багатыр, што над Нёмнам
Узносіць свой чуб.
Пазналі нямецкія морды
Міная ў баю,
Удар твой раптоўны і цвёрды
*І помсту тваю.*
Нявінных дзяцей тваіх родных
Забіў немец-кат,
І вецер змёў попел халодны
Ад спаленых хат.
Астаўся адзін ты, нябожа,
Без дзетак, сястры.
Туліла імшыстае ложа,
А грэлі кастры.
Я ведаю — цяжка, мой браце,
Зжыць раны той след
І ўсё дарагое растраціць
На схіле ўжо лет.
Ты-ж цяжкае гора адолеў,
Не здрадзіў сябрам,
Сказаў ты, герой наш: «Ніколі
Сяброў не прадам!»
Ты мужныя рукі і сэрца
Народу аддаў.
Смерць, смерць немчуры-крыважэрцам!
Згінь, Гітлер-удаў!
Дазволь-жа сказаць табе шчыра:
Жыві, наш Мінай!
Разгорнем рамёны мы шырай
І вызвалім край.**

**ПАРТЫЗАНАМ І ПАРТЫЗАНКАМ — УЗМАЦНІЦЬ ПАРТЫЗАНСКУЮ ВАЙНУ Ў ТЫЛУ НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ, РАЗБУРАЦЬ СРОДКІ СУВЯЗІ І ТРАНСПАРТА ВОРАГА, ЗНІШЧАЦЬ ШТАБЫ І ТЭХНІКУ ВОРАГА, НЕ ШКАДАВАЦЬ ПАТРОНАЎ СУПРОЦЬ ПРЫГНЯТАЛЬНІКАЎ НАШАЙ РАДЗІМЫ!**

(З першамайскага загада Народнага Камісара Абароны І. Сталіна).

## НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ!

73517. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# РАЗДАВИМ фашистскую ГАДИНУ



АГИТПЛАКАТ, ИЗДАНИЕ ГАЗЕТЫ „ЗВЕЗДА" ОРГАН ЦК КП(б)Б.
№ 23. Сентябрь 1941 г.

## КОМСОМОЛЬЦЫ, В СВЯЩЕННУЮ БИТВУ, В БЕССМЕРТНЫЙ ПОХОД ВАС ОТЧИЗНА РОДНАЯ И СТАЛИН ЛЮБИМЫЙ ЗОВЕТ!




### КОМСОМОЛЬСКИЙ БИЛЕТ

Ревут снаряды и пули косят—
Это наш фашистам ответ,
В горячую эту осень
Я получил комсомольский билет.
Билет вручен мне на поле брани.
Я эту честь оправдаю в бою!
С этим билетом в нагрудном кармане
В битву иду за отчизну свою.
Пусть мракобесы скрежещут зубами.
Винтовка в руке и билет на груди.
Победу мы вознесем, как знамя,
И жизнь, и бои у нас впереди!
А если погибну—не жалко и жизни.
Я жертвовать буду собой!
За честь и свободу любимой отчизны,
Вперед, комсомольцы, на бой!

Ефрейтор Т. ПЕТРЕНКО.

Младший лейтенант комсомолец Талалихин, израсходовав боеприпасы, догнал в районе Москвы и протаранил фашистский бомбовоз. Талалихин остался невредим.



С неба нашего высокого
Вниз стервятники летят.
Комсомольцы, наши соколы,
Немцев в воздухе громят.
Лейтенанту Талалихину
Слава, слава и почет.
Протаранил в небе лихо он
Вражий подлый самолет.



На фронте, в немецком тылу-ли
Не берут комсомольца и пули.
Горяча комсомольца рука,
Враг живым не уйдет от штыка!

# ГДЕ ЛИШЬ СТУПИТ ФАШИСТА НОГА, ОСТРОЙ САБЛЕЙ, СВИНЦОМ И КАРТЕЧЬЮ БЕЙТЕ В САМОЕ СЕРДЦЕ ВРАГА, ИСТРЕБЛЯЙТЕ ФАШИСТСКУЮ НЕЧИСТЬ!



Гитлер в ярости и злобе
Брызжет гневные слова:
— Руки где?
— Отбиты обе...
— Так зачем мне голова?
Мне лишь руки для войны,
А не головы, нужны.



Смесь собаки с крокодилом,
Раз'яренная горилла,
Хищный волк в железной
шкуре,—
Вот каков фашистский фюрер.

Вот такая бестия
Хочет в дом залезть к нам.
Знаем мы, что делать надо—
Уничтожить немца-гада!



Нес для нас он перекладину,
Нес для нас нужду и смерть,—
Сам-же будет Гитлер-гадина
В собственной петле висеть.

* * *

## Господин и слуга



Слуга: Господин Геббельс, от взрыва бомб рухнул пятиэтажный дом господина Шуллера.

Геббельс: Не беда. В нашей сводке мы сообщим, что рухнул дом в Москве.

Слуга: В вашем кабинете тоже провалился потолок.

Геббельс: Беда! Откуда же я сейчас буду брать цифры для очередной сводки о русских потерях?



Бегал за свиньей, прохвост,
Уморился дюже.
Ухватил свинью за хвост,
Но свалился в лужу.

Близко, кажется, видать,
Да не тут то было:
Лезет наше сало брать,
Получает в рыло.

## Белорусские пословицы

Дай фашисту в ребро—сделаешь себе добро.

Немцы два дня побывали и все, что могли забрали.

Дождик идет—тучи низко. Удирают немцы—партизаны близко.

На чужой каравай—рта не раскрывай.

Немец—тот же волк,—бей его, так будет толк.

Лютый, как зверь, дурной, как пень, без сил, а лезет, Кто это будет? (Отгадка: Гитлер).

С железным грузом завяз немец пузом.

Храбрилась ворона перед соколом, когда летала около. А когда подлетела близко, от страха пала низко.

## КАК НЕМЕЦ НА СВИНЬЕ В ВЕЧНЫЙ ПОКОЙ В'ЕХАЛ

Пришли мы с Пантелеем разузнать, много ли в деревне немцев; спрятались в сарай и смотрим. Видим—бродит по улице свинья и выходит из хаты долговязый немец — обтрепаный, общипаный, на лице — злость и живот к спине присох. Плохо немецкой морде в пустой деревне! Люди ушли в лес, некого грабить. И детей увели с собой,—некого стрелять для забавы.

Увидел немец-волк свинью, и весь просиял. Как бросился к ней—обхватил руками, прижался мордой к свиному заду. А свинья бежит и тянет за собою немца. А немец кричит, лопочет. Выбежал ему на помощь еще один и побежал за свиньей.

Сожрут, сволочи, свинью,—подумали мы.

Тут перепуганная свинья с визгом как махнет к нам в сарай, а немец с нее свалился прямо Пантелею к ногам. Пантелей махнул колом—и немецкая морда расплылась в навозе. Тут и второй немец вскочил в сарай и следом за первым—в вечный покой попал.

Игнат БУЛАВА,
из под Турова.



Захотелось мерзкой твари
Влезть в советский светлый
дом:
Дали немцу мы по харе
Русским боевым штыком!

Редактор:—редколлегия

*СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!*

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

№ 38 ГАЗЕТА-ПЛАКАТ, ВЫДАННЕ АДДЗЕЛА ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ ЦК КП(б)Б Сакавік 1942 г.




## БЛІЗАК ЧАС ВЫЗВАЛЕННЯ

Нямецка-фашысцкая грабармія церпіць паражэнне за паражэннем. Пад ударамі Чырвонай Арміі яна адкатваецца на захад. Адступаючы, фашысцкія орды разбураюць і паляць нашы гарады і сёлы. Дарослых мужчын і жанчын яны гоняць у Германію на катаржныя работы, у канцэнтрацыйныя лагеры, забіваюць нашых дзяцей і грабяць усё да ніткі.

Браты і сёстры — беларусы! Не давайце гітлераўскім бандытам паліць вашы хаты. Не давайце ім вывазіць награбленае дабро. Арганізуйце абарону населеных пунктаў!

Доблесныя палкі і дывізіі Чырвонай Арміі дайшлі да роднай нашай беларускай зямлі. Блізак час вызвалення. Настаў дзень расплаты з крывавым ворагам.

Падымайцеся ўсе, каму дорага наша радзіма, на ўсенародную барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў!

Бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў! Пашырайце партызанскую барацьбу. Рабіце ўсё, каб наблізіць дзень разгрома і пагібелі крывавага фашызма.

## КЛЯТВА ПАРТЫЗАНА

Я сын радзімы, партызан,
Пакуль у сэрцы маю сілы,
Клянуся: мною будзе дан
Адпор фашысцкаму грамілу.

За нашы сёлы, гарады,
За кроў, за спаленыя хаты
Я буду ворагу заўжды
Чыніць нястомную расплату.

Клянуся: храбра ваяваць
І з нашай Арміяю радам
Ваяк нямецкіх вынішчаць
Штыком, і куляй, і снарадам.

Клянуся я — ісці ўперад,
Нястомна за радзіму біцца.
Клянуся — родны свой народ
Не дам у рабства чужаніцам!

Партызаны і партызанкі! Радзіма заклікае вас помсціць фашысцкім варварам, бязлітасна знішчаць людаедаў за дзікія гвалты над совецкімі людзьмі, за забойствы і грабяжы, за кроў і слёзы безабаронных старыкоў, жанчын і дзяцей!

Не давайце акупантам ні сну, ні адпачынку! Граміце тылы нямецкіх захопнікаў, зрывайце снабжэнне фашысцкіх войск зброяй, боепрыпасамі і харчамі, парушайце сувязь, знішчайце жывую сілу і тэхніку ворага! Да зброі, беларускі народ! Вораг будзе разбіт і назаўсёды выгнан з нашай роднай зямлі!

# НЯХАЙ ЯРЧЭЙ РАЗГАРАЕЦЦА ПАЖАР НАРОДНАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛУ ВОРАГА!

**ТАК СУСТРАКАЮЦЬ ПАРТЫЗАНЫ ГІТЛЕРАЎСКАЕ ПАПАЎНЕННЕ**



Гэты чорны гад
Каля хатаў лазіў.
Хаты ўсе падрад
Абліваў ён газай.

Толькі падпаліў
Хату ён Івана,
Як насцігнут быў
Смелым партызанам.

**ТАК ПРАВАЖАЮЦЬ ПАРТЫЗАНЫ ГІТЛЕРАЎСКІХ КАДРАВІКОЎ.**



Біты морды, бокі біты,
Фрыцы слёзы льюць.
Тры нямецкія бандыты
У палон брыдуць.
Ад надзьмутасці ні знаку,
За вярсту — смурод,

Да чаго дайшлі ваякі.—
Фашыстоўскі зброд.
Падганяе штык іх з-заду
І трасе мароз.
К партызанскаму атраду
Іх вядзе Хвядос.

**16-я нямецкая армія, якая знаходзіцца ў акружэнні, галадае. Мяса дохлых коней лічыцца нямецкім камандаваннем лепшым блюдам для галодных нямецкіх салдат. Аб спажыванні мяса коней выданы спецыяльныя загады.**

**(З газет)**



## ПЕСНЯ САЛДАТА 16-й НЯМЕЦКАЙ АРМІІ

Мы з голаду пухнем
І гінем,
Не міла нам сонца і
свет.
Адзінае мяса—каніну
Штодзень нам даюць
на абед.
А скора не стане
каніны,
Нам суджана ў снезе
скалець.
Не ўбачым свайго мы
Берліна,
Чакае нас чорная
смерць.

(Знойдзена ў забітага ефрэйтара Крацэ)

## АБ ПАЕЗДЦЫ РЫБЕНТРОПА ПА ЗАХОДНЯЙ ПА ЕЎРОПЕ

Немцы лазяць па
Еўропе
Па васалах, па
халопах,
Сабіраюць розны
зброд
На вясенні на паход.
То к румынам, то к
аўстрыйцам
Ездзяць бітыя
арыйцы
Толькі б дурня як
загнаць
У заўшывеўшую
рацъ.



## СВАЕ ПАДВЯЛІ

**(Маленькі фельетон)**

У адзін з цэнтральных вар'яцкіх дамоў Берліна нечакана прыехаў фюрэр. Перапалоханы начальнік спрабаваў арганізаваць парад псіхаў, але не вышла. Большасць вар'ятаў таксама лічылі сябе «фюрэрамі» і дэманстратыўна пакінулі строй.

Фюрэр вельмі спяшаўся і адразу палез на трыбуну.

— Арыйцы! — прахрыпеў фюрэр. —Прышла чарга і да вас. Мае салдаты на фронце паразумнелі. Акрамя таго, іх малавата засталося, а мне зараз патрэбны новыя салдаты, якія-б не думалі, як ім жывымі дамоў вярнуцца. Думаю за ўсіх — я!

Вар'яты моўчкі падазрона слухалі фюрэра.

— І вось я ліквідую ўсе вар'яцкія дамы, а ўсіх вас залічваю ў дывізію для псіхічных атак... На фронт! Я пачынаю вялікае вясенняе наступленне.

Словы фюрэра нечакана заглушыліся бурнымі воплескамі. Усе вар'яты ў адзін голас закрычалі «Хайль Гітлер», і пачалі віншаваць адзін аднаго, што да іх палка прыбавіўся сапраўдны звар'яцеўшы фюрэр. Усе вар'яты кінуліся к фюрэру пацікаць яму рукі, дзякаваць, што ён не пакрыўдзіў іх і прыехаў лячыцца з імі разам.

Раззлаваны фюрэр ледзь вырваўся з вар'яцкага дому і загадаў ехаць у крымінальную турму. Там усё-ж свае людзі.

— Здарова, браты!—Па-сяброўску прывітаўся фюрэр з астрожнікамі.

— Хайль!—Весела гаркнулі рэцыдывісты, убачыўшы свайго фюрэра, знаёмага па мюнхенскай маліне.

— Хлопцы! Ёсць мокрае дзела... Я пачынаю вясенняе наступленне на большэвікоў... Маіх салдат перабілі і мне зараз патрэбны новыя і, акрамя таго, свае, надзейныя людзі. Вас чакае сапраўдная работа. Канешне, ваша тэхніка крыху адстала, але мае обер-бандыты за некалькі дзён навучаць вас распорваць жанчынам жываты, калоць дзяцей, адсякаць ногі і рукі. Гэта не так ужо цяжка і страшна...

— О, майн гот...—застагнаў нехта. З лаўкі ўзняўся стары рэцыдывіст, ветэран нямецкіх астрогаў. — Адольф, да чаго ты дайшоў! Праўда, яшчэ ў мюнхенскім шалмане ты лічыўся ў нас праджаным жулікам. Мы зладзеі, узломшчыкі, але не людаеды... ...Брыдка, Адольф. Адыйдзі лепей, пакуль пяро пад лапатку не ўставілі... Астрожнікі моўчкі праводзілі Гітлера да дзвярэй.

— Што-ж рабіць?—Думаў Гітлер, бегаючы па сваёй канцыляры.—З кім пачаць наступленне, калі нават бандыты, свае блізкія людзі—падвялі... На каго-ж спадзявацца?

К. ГУБАРЭВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ
7891

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ — ПЕРАДАЙ ТАВАРЫШУ

# Партызанская дубінка

Нядзеля. 7 чэрвеня 1942 г.
№ 4—5

САТЫРЫЧНЫ ЛІСТОК. ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ „ЗА СВАБОДНУЮ БЕЛАРУСЬ“.

## Паганую траву з поля вон

Паглядзі на беларуса—
Стан высокі, волас русы,
Дужы, спрытны на руку.
Ён касіў калісь умела
(Аж зямля пад ім звінела)
І мурог, і асаку.
А цяпер у полі чыстым,
Не схіліўшы галаву,
Косіць смела ён фашыстаў,
Як паганую траву.

Тарас ПАЛЯШУК.



## НА ЧУЖЫ КАРАВАЙ РОТА НЕ РАЗЯЎЛЯЙ






1. Немцы рады, немцам люба,
Загадалі грань у трубы:
„Ад сялян нам чэсць якая!—
Хлебам-соллю сустракаюць“.




2. Згаладалыя ваякі
Абступілі, як сабакі,
Белы, пульхны каравай:
„Разразай! Хутчэй давай!“
Бліснуў нож. І раптам выбух
Палыхнуў агнём у шыбы—
Не знайсці ні рук, ні ног,
Ні штаноў, ні валасінкі...
Бо пшанічны той пірог
Быў з гранатнаю „начынкай“

Тарас ПАЛЯШУК.

Малюнкі мастака В. МІНАЕВА.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# Раздавім фашысцкую гадзіну

№ 78
Люты
1943 г.
Выданне
ЦК КП(б)Б

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**ДЛЯ УЗНАГАРОДЖАННЯ ПАРТЫЗАН АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ Ў ПАРТЫЗАНСКАЙ БАРАЦЬБЕ Ў ТЫЛУ СУПРОЦЬ НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ, УСТАНОЎЛЕНА МЕДАЛЬ «ПАРТЫЗАНУ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ» ПЕРШАЙ І ДРУГОЙ СТУПЕНІ.**

(Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР надрукаван на другой старонцы).




Тым слава, хто б'ецца аддана,
Хто ўсцеле чужынцамі шлях,
Хто носіць медаль партызана
За подвігі ў жорсткіх баях.




Гэты немец жонцы піша:
«Думаў—свет падзе к нагам,
Але лёс паганы вышаў
І, здаецца, лягу сам».

Угадаў фрыц вельмі ўдала,
Бо яго зямля забрала,
Абарваў жыццё і ліст
Партызанскай кулі свіст.

# А Ў ВОКА

### СТРАШНАЕ СЛОВА



— Чаму Антанеску ўцякае ад гэтай цудоўнай дамы, як чорт ад ладану?

— Ды гэтая-ж жанчына сваёю прыгожасцю запалоньвае мужчын, а яго кідае ў дрыжыкі пры адным слове палон.

### НЕБЯСПЕЧНАЯ ХВАРОБА



— На што вы скардзіцеся, хворы?

— Доктар, цяжка! У мяне зуб на зуб не трапляе. У мяне сударагі.

— Калі ў вас наступаюць гэтыя сударагі?

— Калі наступаюць рускія.



### ДОБРАБЫТ ФРЫЦА

— Як ты сябе адчуваеш, Ганс?

— «Блёхавата».

— А ты, Фрыц?

— «Паршыва».

# Прыгоды дзеда Міхеда Дубняка



Анатоль Астрэйка — Малюнкі Г. Вальки

## V. КАНЕЦ БУРГАМІСТРА*)

Калі важную гаворку
З камандзірам скончыў дзед,
Ён з казанскаю махоркай
Выняў вышыты кісет.
Падвастрыў пасля сякеру,
Трохі пілачку развёў,
Плашак некалькі намераў,
Ды і клёпак накалоў.
Камандзір паклаў на грудзі
Дзеду рукі назнарок:
— Хай табе шчаслівым будзе
Кожны дзень твой,
кожны крок.
А калі ўжо што часамі
Ды адбудзецца не так,
Тут-жа мы пад бокам самі,
Дай, Міхед, нам толькі знак.

* * *

І нагнала ў вёску немцаў
З перцам руская зіма!..
І па хатах і па сенцах—
Проста ліку ім няма.
Мінамёты і гарматы,
Дзве танкеткі, танкаў пяць,
На двары ля шостай хаты
Аўтаматчыкі стаяць.
Дзед спыніўся ў хаце Глеба,
Выняў снасць і здзеў кажух
І майструе ён для хлеба
З дуба чорнага дзяжу.
Дзень, другі—дзяжа гатова,
Хлеб, кабета, расчыняй!
А дзяжа? Дзяжа на слова!
Лепшай нават не шукай.
І пайшла па вёсцы слава,
Рады людзі, рад і госць:
Зробіць цэбар, зробіць лаву,
Кола? Дзень — і кола ёсць.
Бургамістр нарэшце дзеда
Ўбачыў і гаворыць так:
— Малайчына! Я не ведаў.
Зладзь мне кадку і латак.





— Калі ласка. Твае грошы,
Матар'ял к таму харошы,
Дуб, асіна, хвоя, клён—
Зробім праз пару дзён.
Дзед за працу ўзяўся смела.
Ён у кадках ведаў толк.
Будуць, значыць, козы цэлы,
Дазарэзу сыты воўк.
Дзень прайшоў, другі мінае.
Клёпкі ёсць і абручы.
— Дзе-ж кадушка?—пан пытае.
— Будзе к заўтрашняй начы.
Тры разы прыладжваў вечка.
«Добра». Тут і пан ідзе.
— Кадку я занёс на рэчку,
Каб праверыць на вадзе.
Я зрабіў пасуду гладка.
Пойдзем, глянем завідно.—

Бургамістр нагнуўся ў кадку,
Дзед яго таўхель на дно.
— Ціха, гад! Крычаць не варта,
Я вядомы дзед Міхед.
Крыкнеш,—я кажу не жартам,—
Пакаштуеш пісталет.
Вечка дзед паклаў на кадку,
Стукнуў раз па абручу.
«Бочка, значыць, у парадку,
Зараз пана пракачу!»



* * *

Дзед дабраўся да атрада
Без здарэнняў, без прыгод.
— Ну, а як-жа, дзеду,
з гадам?—
Дубняка спытаў народ.
Хлопцы кадку правяраюць:
Што тут — піва ці віно?
Дзед памалу адчыняе
Таямнічай кадкі дно.



З кадкі лезе нечакана
Сам нямецкі бургамістр.
Глянуў ён на партызанаў
І затросся, нібы ліст.
Лес заліўся дружным смехам.
Вось дык справа! Вось дык так!
Ну і штучку-ж на пацеху
Хлопцам выкінуў Дубняк!

*) Працяг. Пачатак у № 70, 73, 74.

А81 РЭДКАЛЕГІЯ.

*СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!* ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

№ 31 АГІТПЛАКАТ, ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ „СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"—ОРГАН ЦК КП(б)Б Люты 1942 г.

## ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ НАРОДНЫМ МСЦІЦЕЛЯМ— ПАРТЫЗАНАМ, ПАМОЧНІКАМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!



### Біблія людаеда

— Бог Вотан на небе,
Адольф — на зямлі, —
Вось мой закон і скрыжалі:
Бі, разбурай, душы і палі,
Каб падалі ніц і дрыжалі.

Той самы любімы з маіх
салдат,
Хто гэты закон выпаўняе
аддана,
Хто самы крывавы
бязлітасны кат,
Таму і любоў і пашана.

Хто кроў чалавечую піць
прывык,
Жанчынам вырэзвае грудзі,
Хто храбра дзяцей падымае
на штык,
У царстве нябесным той
будзе.

Я кроўю абшары зямныя
заллю,
І стануць рабамі народы,
І будуць угнойваць сабою
зямлю,
У славу арыйскай народы.

Да ўлады я смела па трупах
пайду,
Ступаючы кованым ботам,
І свет, як канцлагер вакол
абвяду
Калючым гартованым
дротам.

*

Мы на гэта скажам гаду:
— Грозен рак ды вочы
ззаду!




### Апошняя стаўка Гітлера

Заядлы ігрок і ўпарты
Гітлер — фашысцкі пёс.
Паставіў усё ён на карту —
Гонар дзяржавы, свой лёс.

Геббельс круціць шарманку,
Значыць — у Гітлера туз;

Крыкнуў ён хрыпла: «Па
банку!
Іду... на Совецкі Саюз».

Мы адказалі: «Біта!
Пад Растовам і пад
Масквой...»
Цяпер мы прымусім бандыта
Расплаціцца сваёй галавой.

### Сніўся вароне арліны палёт...

Гітлер сніў салодкі сон,
Быццам ён — Напалеон,
Выклікае недавер'е
У нас эрзац Напалеона.

Як павыскублі мы пер'е,
Дык акажацца варона,
Што прыбралася была
Пад французскага арла.

## БІЦЕ, ГРАМІЦЕ НЕМЧУРУ, ПОКУЛЬ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ НЕ ЗАСТАНЕЦЦА НІВОДНАГА ФАШЫСТА!

# ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ГОНІЦЬ НЕМЦАЎ НА ЗАХАД
# ПАРТЫЗАНЫ, ЗНІШЧАЙЦЕ АДСТУПАЮЧАГА ВОРАГА!



I

Лез немец да нас на гару —
Вось, думаў, дабра набяру.
Пяўся ён, пяўся
Аж пакуль не ўмараўся.



II

А як умараўся,
Дык з гары сарваўся,
Толькі ловіць рукамі ў паветры,
А смурод — за тры кіламетры...
Ой, не ў добрую, знаць, пару
Палез ён да нас на гару.

Паў на дол немчура паганы —
Дзе тут падлічваць болькі ды раны!
Так і пабег ён, увесь абмараны:
Як даў драпака без аглядкі,
Толькі мільгаюць пяткі.

—

Вось табе, гад, за твае парадкі.

## ЗА РОДНУЮ БЕЛАРУСЬ

Навайстру я шаблю рускую,
Натачу.
На зямлю на беларускую
Палячу.

Стогне там матуля мілая
Пад ярмом.
Стукну па варожай сіле я
Перуном.

Галава з плячэй без шораха
Паляціць.
Па зямлі па нашай ворагу
Не хадзіць.

Не гаруй-жа, маці родная,
Ды не плач.
Мчацца коні быстраходныя,
Мчацца ўскач.

А на іх сыны Даватара,
Казакі.
Чуеш — гулкія раскаты там
Ля ракі.

То у шыю гоніць конніца
Немчуру.
Мы прыйшлі к тваёй
ваколіцы,
Беларусь.

Заўтра хлынуць танкі
грозныя
Па снягу.
Ночкай я к табе марознаю
Забягу.

Вытру вочы ў маці ўпалыя
Ад слязін.
А на заўтра ў бой са славаю
На Берлін!

**Анатоль АСТРЭЙКА.**

## ПАРАД КРЫЖАНОСЦАЎ

I



За Брусель і за Парыж,
За Белград і за Афіны,
За пажары, за руіны
Начапіў ім Гітлер крыж.
Крыж жалезны —
ганьбы знак,
Чорны, як душа
фашыста;
Цешыў ён сваіх сабак,
Абяцаў ім урачыста,
Што за лета, да зімы,
Будзем знішчаны і мы.

## ПАРАД КРЫЖОЎ

II






Дзе гігант Напалеон
Да магілы значыў
след,
Там сягоння крочыць
ён —
Карлік Гітлер-людаед.
Ён бяжыць ужо, не
крочыць,
А груган яму
прарочыць
З прыдарожнае сасны:
«Не дацягнеш да
вясны.
Тут я цешыўся вачамі
Грэнадзёр-французаў:
Забяспечваў нас
харчамі
Генерал Кутузаў.
Ты-ж хваліўся лепшай
расай,
Быў фашыст заядлы:
На цябе гляджу я
ласа...
Ох, наемся досыць
мяса
Я арыйскай падлы».

Гневам, помстаю
гарачай
Іх сустрэў герой-
народ:
Смерцю чорнаю
сабачай
Тут палёг фашысцкі
зброд.
За пакуты, кроў
і слёзы,
За разбой і грабяжы
Ім дрыўлянья з
бярозы
Забяспечаны крыжы.
Хай ім шыле Гітлер
ласкі,
Хай ім Геббельс бае
казкі
Хоць у сотню языкоў,
Мы прынялі іх
па-наскі:
Засталіся толькі
каскі
Ад арыйскіх чарапкоў.

Тэксты К. КРАПІВЫ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

6843

*СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!* ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

№ 39 ГАЗЕТА-ПЛАКАТ, ВЫДАННЕ АДДЗЕЛА ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ ЦК КП(б)Б Сакавік 1942 г.




## ЗАРА ВЫЗВАЛЕННЯ ЗАЙМАЕЦЦА НАД БЕЛАРУССЮ

Беларусь, родная Совецкая зямля!

Ты зноў чуеш громы ваеннай навальніцы. Зноў садрыгаюцца лясы і прасторы тваіх палёў ад гуду гармат, ад грукату танкаў і рэву самалётаў.

Вялікія бітвы пачаліся і кончацца на табе, беларуская зямля. Але не з цёмнага фашысцкага захаду, а з ясных усходніх далячынь грыміць сёння пераможнае водгулле вайны і плыве ўсё далей і далей на захад, як голас прадвесня, як весць тваёго вызвалення.

Не палон і няволя, не чорная ноч пакуты, а радасць волі і яснасць сонечнага дня звіняць у гэтым водгуллі. На захад ідзе Чырвоная Армія, жалезнаю мятлою вымятае грабежніцкія орды ашалелага фашызма.

**Якуб Колас.**

# ГІТЛЕР АБМАНУЎ НЯМЕЦКІ НАРОД І САЛДАТ

**АФІЦЭРЫ І САЛДАТЫ, ОБЕРЫ І УНТЭРЫ ЎСЕ ЧАСЦЕЙ ПАЧЫНАЮЦЬ ГАВАРЫЦЬ АБ СВАЁЙ БЛІЗКАЙ ПАГІБЕЛІ. УДАРЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ УНУШАЮЦЬ ІМ СМЯРОТНЫ СТРАХ. ЯНЫ ПАЧЫНАЮЦЬ РАЗУМЕЦЬ, ШТО ПОЎНЫ РАЗГРОМ НЯМЕЦКАЙ АРМІІ НЕМІНУЧЫ.**

**ГІТЛЕРАЎЦЫ ЗАСКАВЫТАЛІ, ЗАВЫЛА ФАШЫСЦКАЕ ЗВЯР'Ё:**

**«Я БОЛЬШ НЕ ВЕРУ Ў ПЕРАМОГУ ГЕРМАНІІ,— ЗАЯЎЛЯЕ ПАЛОННЫ НЯМЕЦКІ САЛДАТ 8 РОТЫ І ПАЛКА ДЫВІЗІІ «СС» «МЁРТВАЯ ГАЛАВА» ХОРС КАРГЕ.— ВАЙНУ МЫ, НЕМЦЫ, ПРАІГРАЛІ, СТАНОВІШЧА НАША БЕЗНАДЗЕЙНАЕ».**

**«ДАРАГІЯ БАЦЬКІ! ВАМ ПІША ВАШ СЫН ЮСІФ КРОГМАН,— ВЫ ЗАКАЗАЛІ ДЛЯ НАС ЧАТЫРЫ АБЕДНІ. МАЛІЦЕСЯ ЗА НАС. ВОСЬ ЗНОЎ ЛЯЦЯЦЬ РУСКІЯ»...**

**МЯРЗАЎЦЫ ВЫРАШЫЛІ МАЛІЦЦА ПЕРАД СМЕРЦЮ. АЛЕ КОЛЬКІ-Б ЯНЫ НЕ МАЛІЛІСЯ, КОЛЬКІ-Б АБЕДНЯЎ НЕ ЗАКАЗВАЛІ, РАЗГРОМУ І СМЕРЦІ НА РУСКАЙ ЗЯМЛІ ІМ НЕ МІНАВАЦЬ.**

«Фюрэр нас паслаў на смерць. Ён кажа нам, што няма больш благаслаўлёнай смерці, чым смерць салдата. Мерцвяку не пагражаюць перажыванні, расчараванні, хваробы і старасць».

(З пісьма нямецкага ефрэйтара Карла Брайме).



«Памірай, салдат, у полі»,—
Раіць ім арыйскі «бог».
А салдат цвярдзіць: «Даволі!
Я хачу, каб ты падох».

«Па дарозе на фронт я сустракаў «адбіўшыхся» ад часцей нямецкіх салдат. Яны займаюцца крадзяжом ці папрашайніцтвам. Выгляд у іх сапраўдных брадзяг ці жабракоў».

(З пісьма салдата 4 роты 117 нямецкага палка Рудольфа Кноо).



Не армія, а біты зброд,
Хоць пахвалу ім Гебельс пішаІшоў у бляску ён на ўсход,
А вось якім з усхода вышаў.

«Эканомце капіталы нерваў! Не злоўжывайце сваімі і чужымі нервамі. Не хвалюйцеся. Не важна, што вам цяжка на сэрцы. Давайце вясёлую, лёгкую музыку. Маэстра!..»

(З выступлення Гебельса)



Прыбываюць з фронта эшалоны
Фрыцаў бітых, скончыўшых паход.
Гебельс даў загад: на пахаронах
Граць і румбу, танго і факстрот.

«Рускія танкі касілі нашых салдат агнём і душылі гусеніцамі. Падымалася страшэнная паніка. Уцякаць было некуды. У жывых засталася толькі невялікая група салдат. Яны паднялі рукі і здаліся ў палон».

(З паказання палоннага салдата 11 роты 375 палка, 213 нямецкай пяхотнай дывізіі Адольфа Бойма).



«Ад танкаў рускіх нам не ўратавацца,
Агнём пякуць, расціскваюць бранёй.
Убачыш рускі танк, ідзі здавацца,
Калі астацца хочаш з галавой».

## ЗЛОДЗЕЙ КРЫЧЫЦЬ: „ЛАВІ ЗЛОДЗЕЯ“

«За апошні час у батальёне да пагражаючых памераў узрос лік салдат, парушыўшых статут унутранай службы і зрабіўшых кражу ў сваіх таварышоў».

(З загада камандзіра 2 батальёна 222 нямецкага пяхотнага палка Шэфенберга).



Кралі, грабілі ў чужых
Па свінячы, без сумлення,
А цяпер ужо ў сваіх
Чысцяць ранцы і кішэні.

Б'юцца між сабой, злуюць
Да хрыпот у брудным горле:
«Сам не ўспееш пацягнуць,
А ў цябе усё папёрлі».

«Скора вясна. Растае снег. К вясне, спадзяюся, нас адвядуць у тыл. Бо мы-ж уяўляем сабою нейкі зброд».

(З пісьма нямецкага обер-ефрэйтара К. Вернера Георгу Куніцу)



— Не падай духам, Конрад, фюрэр гаворыць, што скора вясна. Бачыш — навокал «падснежнікі».

— Та-а-ак, Рудольф. Гэта усё, што засталося ад нашай вясенняй дывізіі, і гэта толькі кветачкі, а ягадкі, сапраўдныя, рускія ягадкі будуць...

«Мілая Эльза! Усё скончана. Мы ўсе тут загінем. Мы нясём велізарныя страты. Каб скрыць гэтыя страты, нашы афіцэры спальваюць не толькі забітых салдат, але і цяжка раненых. Які жах! 80 чалавек раненых жыўцом спалілі. Дзесяткі забітых і раненых кінулі пад лёд. Я гэта бачыў сам».

(З пісьма нямецкага салдата Аўгуста Фенеля).



«З халоднай і грознай краіны савецкай
Пішу я табе мо' апошні ўжо раз.
Па ўказцы фон-Буша салдатаў нямецкіх
Параненых топяць і паляць у нас.
Савецкая куля мяне не мінуе,
І спаляць мяне ці апусцяць пад лёд.
Я плачу ад страху, ад жаху дрыжу я,
За смерцю пагнаў мяне Гітлер на ўсход».

7899

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ — ПЕРАДАЙ ТАВАРЫШУ

# Партызанская дубінка

Нядзеля, 12 ліпеня 1942 г.
№ 7

САТЫРЫЧНЫ ЛІСТОК. ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ „ЗА СВАБОДНУЮ БЕЛАРУСЬ“.



Таварыш!
Нямецкі забойца крывавы
Спаліў тваю хату, стаптаў тваю славу.
А зараз зарэзаць ад злосці ідзе ён
Дзяцей тваіх — радасць тваю і надзею.

Таварыш!
Схапі яго, покуль не позна,
За лапу крывавую смела і грозна,
Заткні яму куляй гарачаю рот
І чорнае сэрца прабі навылёт.

# ЯК ГУКНЕШ, ТАК І АДГУКНЕЦЦА




Бэндэраўца падлюгу
Лёгка купіш на паслугу.
Ён без платы нават рады
Немцу вылізаць азадак.

Каб зрабіць прыемней Фрыцу,
Ён гатоў гразі напіцца;
Ён гатоў сем раз на тыдні
Запрадаць народ свой злыдням.

Ён гарлае аж да зморы:
,,Беларускі корпус створым!“
Б'е нягоднік гучна ў грудзі:
,,Адгукнуцца хутка людзі“



Сапраўды, на голас катаў
Адгукнуліся адразу—
Куляй меткай і гранатай
Сталі гэту біць заразу.

Дасталося тут і пану
І ягоным псам слухмяным.
Смерцю банду палівалі,
Лупцавалі, прымаўлялі:

,,Не дурыце нам галовы,
Не паскудзьце нашай мовы.
Пойдзем мы не ў корпус гадаў,
А да партызан ў атрады“.

Малюнкі мастака В. МІНАЕВА.

Тэксты Тараса ПАЛЯШУКА.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Прачытай і перадай другому

# РАЗДАВІМ фашысцкую гадзіну

№ 58

Жнівень 1942

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі.

НЯХАЙ ВОРАГ АДЧУЕ НА САБЕ ЎСЮ СІЛУ НАШАЙ ЯРАСНАЙ ЗЛОСЦІ, УСЮ СІЛУ НАШАЙ НЯНАВІСЦІ! „...НЕЛЬГА ПЕРАМАГЧЫ ВОРАГА, НЕ НАВУЧЫЎШЫСЯ НЕНАВІДЗЕЦЬ ЯГО ЎСІМІ СІЛАМІ ДУШЫ“.

(І. Сталін).

## ЗА ЖЫЦЦЁ, ЗА СВАБОДУ!

**У імя жыцця народа, у імя свабоды радзімы** Герой Савецкага Саюза, малады беларускі партызан **Міхаіл Сільніцкі** ў жорсткім, няроўным баі стрымліваў шалёны націск немцаў. Ад яго меткіх і бязлітасных удараў гінулі раз'юшаныя звяры. Не стала патронаў. Сільніцкі смяртэльна ранены. Ён у акружэнні ўжо смакуючага перамогу ворага. Але партызаны не здаюцца! Сэрца патрыёта кіпела лютай нянавісцю да ворага. Яго суровая помста апустошыла нямецкія рады. **Вораг не прайшоў!** Партызанскі атрад выканаў сваю баявую задачу.

**У імя жыцця і свабоды** бясстрашна штурмавалі неба, пакрытае чорнымі фашысцкімі хмарамі, праслаўленыя ў баях сыны беларускага народа, Героі Савецкага Саюза Нікалай Гастэла і Віктар Талаліхін. З беспрыкладнай мужнасцю ачышчалі яны наша паветра ад фашысцкіх стярвятнікаў і абрушылі на галовы ворагаў сотні тон смертаноснага метала.

У гэтых, як і ў сотнях іншых, подвігах беларускай моладзі, якая геройчна змагаецца супроць ворага, у радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах, — **непераможная сіла любві да радзімы, непераможная сіла нянавісці да ворага.**

Мы абараняем жыццё — нашу маладосць, нашу айчыну, нашу любімую радзіму, нашу шчаслівую будучыню. **Мы нясём радасць жыцця, перамогу над смерцю.**

**У імя гэтага жыцця** запалаў нямецкі склад гаручага узорваны Аняй Шубянок. **У** імя выратавання жыцця Валянціна Герасімава і Елена Жаваранкава пад няспынным агнём праціўніка вынеслі больш сотні раненых байцоў. **У** імя шчаслівай будучыні юны герой Саша Тышкевіч узарваў штабны аўтобус разам з нямецкімі афіцэрамі. **У** імя ажыццяўлення нашай благароднай мэты ляцяць пад адкос паязды, узрываюцца склады нямецкага ўзбраення, знішчаецца фашысцкая погань.

Каб жыць, каб перамагчы,— патрэбна ўсёй душой ненавідзець немцаў, бязлітасна помсціць заклятым гітлераўцам!

**Забі немца!** — гэта заклік дзяўчат, чый голас, звонкая песня і радасны смех звінелі нядаўна на свабоднай зямлі, а зараз задушаны ў няволі.

**Забі немца!** — кліча наша моладзь, чыя прыгожасць, чыя энергія. радавала жыццё, а зараз марнее ў няволі, у рабстве.

**Забі немца, забі звера!**— гэта кліч беларускай зямлі.

**Забі немца, задушы гада!**— шумяць беларускія лясы.

**Забі немца, забі забойцу!**— стогнуць нашы рэкі і вазёры

**Жыццё патрабуе смерці подлым чужынцам!**




КРЫШЫ ПРЫКЛАДАМ, КУЛЯЙ БІ
АРЫЙСКІЯ ТУПЫЯ ЛБЫ,—
ІХ ТАК ГЕРОЙ СІЛЬНІЦКІ БІЎ

# Будзьце такімі як Сільніцкі



Ноччу немцы балююць у хаце,
А Сільніцкі ўжо зняў вартавых,
Размахнуўся і кінуў ім: «Наце
На закуску яшчэ па гранаце,
Каб навек падавіліся вы».
Едуць немцы лавіць партызанаў.
Партызаны ўзялі іх ў абход.
І Сільніцкі б'е метка з нагана
Марадзёраў — фашыстаў паганых,
Здабывае сабе кулямёт.

Аж ад злосці ўзбясіліся каты,
Не дае ім Сільніцкі пажыць,
Дзе ні пойдуць—усюды засады
І ён сам, быццам вецер крылаты,
І яго не так лёгка злавіць.
Разгарэлася бітва аднойчы,
Дзе навіс над Дзвіною абрыў.
Ішлі немцы ў атаку тройчы,
А Сільніцкі ўсю банду іх воўчы
Адбіваў з кулямёта, касіў.

Толькі ўжо усе выйшлі патроны
І сам ранен Сільніцкі. Ну, што-ж!
Партызана не ўзяць у палон ім
Пакуль сэрца ў грудзях яго звоніць,
Пакуль ёсць у руках яго нож.
Там дзе паў ён, вятры засыпаюць
Трупы немцаў гарачай зямлёй.
А геройская слава над краем
Партызанскія сілы ўздымае
І вядзе супроць катаў у бой.



ДЗЕ ЗВЕР ПРЫЛЯЖА ЗМОРАНЫ,
ДЗЕ СЯДЗЕ ЧОРНЫМ ВОРАНАМ,
КАБ ПА ЗЯМЛІ БОЛЬШ НЕ ХАДЗІЎ,
ПАДСЦЕРАЖЫ ЯГО І БІ,—
ЯК НАШ ГЕРОЙ СІЛЬНІЦКІ БІЎ.



ЗА БЕЛАРУСЬ СОВЕЦКУЮ
ЗНІШЧАЙ ЗВЯР'Е НЯМЕЦКАЕ,
КРЫШЫ ПРЫКЛАДАМ, КУЛЯЙ БІ
АРЫЙСКІЯ ТУПЫЯ ЛБЫ,—
ІХ ТАК ГЕРОЙ СІЛЬНІЦКІ БІЎ.

## НАД МАГІЛАЮ ПАРТЫЗАНА

Над магілаю друга
і брата
Мы клянёмся дзяцьмі
і жыццём
Лютым ворагам
смерць і расплату
Напісаць
партызанскім агнём.
Мы клянёмся:
вінтоўкай, гранатай
Помсціць ворагу
днем і ўначы
За цябе,
за разбітую хату,
За бацькоў,
за дзяцей і жанчын.



Мы твой вобраз,
як сонейка чысты,
Пранясём
праз агонь і баі,
Будзем рваць
на кавалкі фашыстаў,
Каб свой боль
у грудзях загаіць.
Не адступім
у бітве да скону
Ні на шаг,
ні на цядзю назад,
Вырвем край беларускі
з палону,
За цябе мы адпомсцім,
наш брат!

73484. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# Раздавім фашысцкую гадзіну

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 142 | Красавік 1945 г. | Цана 50 кап.

***Слава совецкім Войскам, узняўшым сцяг перамогі над Берлінам!***

(З заклікаў ЦК ВКП(б) да 1 мая 1945 г.)

Мал. Д. Красільнікава.



Совецкі ключ да берлінскай брамы.

# Ўсеагульная распрадажа.

Мал. А. Волкава.




Ад Маравы і да Эльбы,
Між каналаў і лясоў.
Дабіваюць нашы стральбы
Лютых гітлераўскіх псоў.

Кляпучы свой лёс і маму,
З гарадка да гарадка
Цягнуць фрыцы рэшткі хламу
І пускаюць з малатка.

Тут і гебельсавы «качкі»,
І няменкія арлы,
І пакаваныя ў пачкі
«Непрыступныя» валы.

Вал усходні, вал заходні
І яшчэ якійсці вал...
Ды ніводзін непрыгодны
Для аховы абдзірал.

І купцоў зусім не стала,
Бо прыканчыўся запас
Нарабаванага сала
І накрадзеных каўбас.

Гітлер сам круціў катрынку,
Ды нішто не памагло:
Пакупцоў няма на рынку
На такое барахло.

А тым часам, быццам бура,
Мы ўварваліся ў Берлін,
І галоўны крамнік—фюрар
Знік, як цень, сабачы сын.

Кажуць, быццам даў ён «дуба»;
Можа й так; калі-ж не так,—
Не міне падлюгі згуба,
Як і ўсіх яго сабак.

І апошні з іх за марку
З малатка прадасца сам,
Каб дастаць пятлю для карку
І не здацца ў рукі нам.

Язэп КАСІЛА

АТ 29163 Друкарня імя Сталіна Мінск, Пушкінская 55. Адказны рэдактар Кандрат КРАПІВА.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ гадзіну

Выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 96 Ліпень 1943 г.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

Помсціць бязлітасна нямецкім захопнікам за кроў і слёзы жонак і дзяцей, матак і бацькоў, братоў і сясцёр.

**(Сталін)**

# На Арлоўска-Курскім і Белгародскім напрамках..

Адольф Гітлер з глыбокім жалем паведамляе сяброў і знаёмых, што дарагі і незабыўны план летняга наступлення 1943 года дачасна скончыўся ад сакрушальных удараў Чырвонай Арміі. Пахаванне адбылося на Орлоўска-Курскім і Белгародскім напрамках.



**Гітлер:** — Як ідзе наша летняе наступленне?
**Генерал:** —Калі так будзе ісці і далей, то нам скора наступіць канец.



— Для выканання задачы я вам даю гадзіну часу.
— Пастараемся ўкласціся!



...Укладіся...



Уціхамірвацель нямецкіх «тыграў» (танкаў Т-6) бронебойшчык гвардыі сержант Пётр Іваноў.

## САПСАВАНЫ АЎТАМАТ

Атрымаў нямецкі генерал з фашысцкіх казарм свежа вымуштраваную партыю аўтаматаў. Радуецца яго воўчае сэрца: аўтамат не разважае, маршыруе, куды за-



гадаюць, страляе, грабіць, ні аб чым не задумваецца. Усё-б было добра, ды праз некаторы час генералу дакладваюць: так, маўляў, і так — аўтаматы ў акопах ляжаць і не падымаюцца. Не інакш, як у механізме нешта заела.

Загадаў генерал паклікаць аружэйнага майстра з гестапо, каб ён поўны рамонт аўтаматам зрабіў, ды позна. Ржа пераела хвалёную нямецкую сталь. Яна не вытрымала рускага агню.

## ПА СВЕЖАМУ СЛЕДУ

Не паспелі немцы, захапіўшы вёску Падасінаўку, уволю пааграбіць, як партызаны так іх турнулі, што аж пяткі заблішчалі.

— Не, гады, не ўцячы вам! — гукнуў стары партызан Міхед. — Паміж іншым яны ў мяне ў хаце чаравікі спёрлі...

Партызаны кінуліся ўдагон. Вёў атрад дзед Міхед.

— Глянь, сляды назад ідуць, куды-ж ты нас вядзеш?



— Пайшлі далей... Я свае чаравікі ведаю, сам-жа іх рабіў.

Партызаны ўвайшлі ў лес і хутка напалі на немцаў. Адабралі ў іх награбленае дабро і знайшлі дзедавы чаравікі.

— Як-жа, дзед, сляды ішлі назад, а ты здагадаўся, на след трапіў?

— Справа звычайная... Немец калі ўцякаў, наўмысля чаравікі задам наперад абуў, але мяне не падманіш, я іх звярыныя норавы ведаю.

Мал. Г. Валька




Гэты альбом знойдзен пры забітым ефрэйтары каля Гомеля.

Будучы вялікім любіцелем фотаздымкаў, Ганс Шнапс сфатаграфіраваўся ў некалькіх выглядах.

1. Ганс Шнапс са сваёй нявестай Шарлотай, зараз самкай злучнога пункта № 1505/2012 горада Мюнхена.
2. Ён-жа ў Парыжы з чамаданам накрадзенага барахла.
3. Ганс Шнапс на фоне звычайнага фашысцкага пейзажа.
4. Ён-жа весяліцца ў Афінах з прычыны дня свайго нараджэння.
5. Ганс Шнапс займаецца жывёлагадоўляй у Даніі.
6. Ганс Шнапс у Беларусі, зняты снайперам партызанам тав. Васілём.

Больш фотаздымкаў Ганса Шнапса не прадбачыцца.

Б 2613 2073

Адказны рэдактар
Кандрат КРАПІВА.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 112 ‖ Снежань 1943 г. ‖ Цана 30 кап.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**З пачатку вайны партызанскія атрады знішчылі 121675 нямецкіх салдат, 3039 афіцэраў, у тым ліку 13 генералаў, пусцілі пад адкос 1079 воінскіх эшалонаў, узарвалі 980 чыгуначных і шасейных мастоў, знішчылі 259 танкаў і бронемашын, знішчылі і збілі 205 самалётаў, 5033 лёгкавыя і грузавыя машыны, 181 базу і склад, 19 штабаў воінскіх часцей і злучэнняў праціўніка, у тым ліку армейскі штаб, карпусны і некалькі штабаў дывізій.**

(З артыкула сакратара ЦК КП(б)Б тав П. ПАНАМАРЭНКА «Партызанская вайна ў Беларусі»)

Мал. Г. Валька.



## СТРЭНЕМ ІХ, ЯК ТРЭБА!

Білі гансаў, білі фрыцаў,
Мы ў краю не мала.
Генерал-жа петушыцца:
— Беларусь мне пакарыцца!..

Смерць і генералу.

Гітлер шле да нас другога:
— Партызанам скруці рогі,
Пакажы ім сілу!..

І другога, дзякуй богу,
Больш не носяць ужо ногі,—
Парыцца ў магіле.

Гітлер страшна ўсхваляваны
— Мне ад гэтых партызанаў
Невыносна стала!

Зноў шле генерала.

Ходзіць той, надзьмуўшы вусы:
— Навучу я беларусаў
Паважаць парадкі!..

Не паспеў ён тут ажыцца,—
Партызаны: — Просім брыцца!
Вілы пад лапаткі.

Гітлер з гора рве чупрыну:
— Што за чортава краіна,—
Заганяе ў дамавіну
Цвет майго ваяцтва...

Кідае ў вар'яцтве
Новых генералаў.
Партызаны:
— Мала
Генералаў шлеш ты:
Падскрабай дарэшты!
Мы сустрэнем іх гасцінна:
Адвядзем па тры аршыны
Жвірыстае глебы.
Стрэнем іх, як трэба!

Антон БЯЛЕВІЧ.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# Раздавім фашысцкую гадзіну

№ 94
ЧЭРВЕНЬ
1943 г.

Выданне
ЦК КП(б)Б

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**Партызаны! Ні днём, ні ўночы не давайце спакою немцам. Шукайце, знаходзьце і знішчайце фашысцкіх захопнікаў!**

Мал. Бларшова



Мы нашу зброю і сцягі
Правадыру кляліся з чэсцю,
Пакрыўшы славай баявой,
Па трупах ворагаў пранесці.
І пранясём, каб зноў зарой
Устала сонца над зямлёй.

# ПРА РАКА, ХАЛУЯ І ФАНЕРУ

Міхась ЛЫНЬКОЎ

Нядаўна ў рэдакцыі адной Віцебскай газеткі, якая выдаецца нямецкімі халуямі, было вялікае ажыўленне. Сам галоўны рэдактар, падгалоўныя, усе рэдакцыйныя слупы, слупкі і качарэжкі да болю мазолілі мазгі над чарговай старонкай сваёй газеты. Рыпелі, трашчалі і ламаліся пер'і, трацілі прытомнасць машыністкі, рвалася папера. Над натруджанымі, прапацелымі, лакейскімі мазгамі стаяла густая мутная пара і з рэдакцыі нёсся такі грукат, што рэдкі праходжы віцебскіх вуліц яшчэ за кілометр ад рэдакцыі падміргваў на яе свайму суседу:

— Глядзі ты іх: у тры сёкачы сякуць, аднаго рака пякуць...

Урэшце гэтага рака спяклі і далі яму гучную назву: „Адкрытае пісьмо панам панікёрам".

Хто-ж гэта там панікуе ў Віцебску?

Канешне, у першую чаргу самі паны халуёў, немцы. Але-ж аб гэтым халуям пісаць няручна і яны па меры ўбогіх сіл сваіх і здольнасцей суцяшаюць свайго брата-халуя. Аказваецца, ходзяць чуткі па Віцебску, што найгалоўны пан халуёў сам Адольф Гітлер хворы. З хворым панам жыццё—не жыццё. Са здаровым яно яшчэ сюды-туды; там недаедкі, там падачка, там штаны з панскага азадка,—глядзіш, халуйскае сэрца і радуецца. А з хворым? Бяда... Адных гаршкоў папацягаеш і ўночы і днём. Ды і гэта яшчэ не бяда, да гаршкоў халуй звычны... Але яго бярэ страх, а што, калі пан возьме ды акачурыцца? Дзе браць тады тыя недаедкі, чый зад лізаць? Усё гэта так усхвалявала халуйскі статак, што для яго супакаення газета была прымушана надрукаваць у сваім пісьме, што называецца, чорным па беламу:

„Мы гаворым, што фюрэр Адольф Гітлер ні ў якім разе не хворы смяртэльна".

Прадбачачы, што гэта суцяшэнне надзвычай слабае, газета суцяшае ортскамендатурай. Справа ў тым, што гэтая камендатура змылася з Віцебска ў невядомым напрамку. А халуі так спадзяваліся на яе... Газета і піша:

„Перамяшчэнне ортскамендатуры ёсць толькі звычайнае перамяшчэнне і нічога болей".

Алебачачы, што гэтая суцеха даволі слабаватая, газета памянула транспарт:

„Што тычыцца ад'езду з Віцебска некаторых паравозаў і вагонаў, то ў справе транспарта гэта ўпаўне нармальная з'ява, калі цягніковыя саставы то выязджаюць, то прыязджаюць".

Гэта, канешне, нармальна, „калі выязджаюць і прыязджаюць". Але справа ў тым, што гэтыя саставы толькі выязджаюць, а прыязджаць, тым больш прыязджаць за нямецкімі халуямі, і не збіраюцца. Гэта і трывожыць халуйскія сэрцы, якія са страхамназіраюць, што разам з гэтымі саставамі выязджаюць на захад і самі паны немцы. Газета спрабуе апраўдаць перад халуямі паводзіны перапужаных не на жарты сваіх паноў:

„Таксама і грамадзяне горада Віцебска нямецкай нацыянальнасці выязджаюць з горада не ад страху перад чырвонымі, яны едуць добраахвотна на працу ў Германію, уцягваючыся, такім чынам, ва ўсеагульную мабілізацыю германскага народа".

Дзіўныя рэчы творацца з немцамі. То яны „ўцягваліся", як апантаныя, на ўсход, а цяпер „уцягваюцца" без агляду ў Германію, разам з жонкамі, з нашчадкамі, з чамаданамі і гаршкамі... Адных толькі халуёў пакідаюць, не да іх панам, калі ў саміх лыткі дрыжаць... Вось чаму і хвалююцца халуі, баяцца апынуцца ў ролі той сучкі, якую звычайна б'юць лютым боем, як і самога пана.

Раней, калі апаноўваў іх сабачы страх, яны знаходзілі хоць некаторае заспакаенне, чытаючы штодня паведамленні пра міфічныя нямецкія перамогі. Гэтыя паведамленні вывешваліся на спецыяльнай дошцы ля гарадской ратушы. Чаго-чаго не выраблялі немцы на гэтай дошцы: і Маскву на ёй бралі, захватвалі і Сталінград, усю Чырвоную Армію знішчылі, усе савецкія танкі разбілі, усю авіяцыю чырвоную паланілі... Да самага Урала дапаўзлі немцы на гэтай дошцы... і раптам такі канфуз: знікла дошка з нямецкімі перамогамі... Ну, проста так, узяла і знікла, нібы яе кот злізаў... Ад усіх нямецкіх „перамог" засталося толькі пустое месца, якое і нагнала яшчэ большага страху на халуёў. Дзікім голасам зараўлі яны: „Божа-ж наш, божа! Куды падзеліся перамогі паноў нашых?" Пачалося такое замяшанне ў халуйскім стане, што газета прымушана была як мага глыбокадумней закрануць і гэтае пытанне:

„Геаграфічная карта з нанесенай на ёй лініяй фронта, выстаўленая на плошчы перад памяшканнем былой думы, знята не пад націскам штурмавых войск Чырвонай Арміі, а толькі таму, што зімнія маразы і вясновыя вятры пакарабацілі фанеру".

Вось якія яны былі, гэтыя „зімнія маразы" і „вясновыя вятры"! Нават на фанеру падзейнічалі... Дрэва і тое падалося... Што-ж казаць ужо аб немцах і аб іх прыслужніках. Даліся ім у знакі гэтыя „маразы" і „вятры", усе мазгі выдзьмулі... А тут яшчэ афрыканскія „вятры" падзьмулі, ды багата яшчэ збіраецца вятроў... Ніколі ўжо не давядзецца халуям убачыць былую дошку з нямецкімі перамогамі... Што і казаць, запарыліся халуі: ні ўзад, ні ўперад... Панам хоць назад шляхі не заказаны, уцякаюць па меры сіл і здольнасцей... Халуям цяжэй, ім туды забаронена, там яны без карысці для пана. Вось і ныюць, і скуголяць, і ламантуюць на ўсю Беларусь... Куды ўцякаць, куды падзецца, куды чамаданішкі цягнуць?

Вось і спяклі рака... А як паспыталі ды пакаштавалі, то ўбачылі, што ён завельмі дохлы, гэты рак... Такі смурод ад яго пайшоў, што багата хто з халуёў, прачытаўшы гэты славуты адкрыты ліст, адразу-ж кідаўся да чамадана і даваў ходу з віцебскіх ваколіц, далей ад таемных „вятроў" і „маразоў".



Цяжка халуям у Віцебску.

А будзе яшчэ цяжэй.

Адказны рэдактар
Кандрат КРАПІВА

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 129 | Май 1944 г. | Цана 30 кап.

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ СОВЕЦКІ НАРОД, ЯГО ГЕРАІЧНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ І ДОБЛЕСНЫ ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ, ЯКІЯ ПАСПЯХОВА ВЫГАНЯЮЦЬ ФАШЫСЦКІХ ВЫРАДКАЎ ЗА МЕЖЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ.**

(З заклікаў ЦК ВКП(б) да 1 мая 1944 года).

Малюнак Кеша.




Зара вызвалення агністым крылом
Зямлю Беларусі ужо ахінае.
І майскі гарматны раскацісты гром
На захад па родных прасторах ступае.

Час блізак свабоды і помсты святой.
Дрыжаць хай ад страху праклятыя каты.
Чырвоная Армія грознай сцяной
Праносіць на захад чужынцам расплату.

Мал. Д. Красільнікава.

# ВЫПРАЎЛЯЛА КЛАРА ФРЫЦА



1. Фрыц з сваёю Клараю
   На змярканні марылі:
   Аб мастацтве, аб кілбасах
   Ды аб іншых рэчах ласых.



2. Выпраўляла Клара Фрыца
   У Расію пажывіцца,
   Абнімала, цалавала —
   На грабеж благаслаўляла.



3. Шнырыць Фрыц па Беларусі:
   — Можа чым і пажыўлюся.
   У музей ён трапіў тут, —
   Вось падаркі — зээр гут!



4. Аблюбована карціна —
   Можна везці да Берліна.
   Вось за гэты падарунак
   Будзе Фрыцу пацалунак.



5. Калі Фрыц валок падарак,
   Партызан схапіў за карак, —
   Фрыцу прагнаму капут,
   Больш не скажа: «Зээр гут».



6. Клара ўсё чакае Фрыца,
   Чамадан ёй поўны сніцца.
   Фрыц-жа ўклаўся пад курганам,
   Пад парожным чамаданам.

22/V—44 г. Заказ 1108. Адказны рэдактар Кандрат КРАПІВА.

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 119 | Люты 1944 г. | Цана 30 кап.

*Сталінград быў закатам нямецка-фашысцкай арміі. Пасля Сталінградскага пабоішча, як вядома, немцы не маглі ўжо апраўіцца.*

*І. СТАЛІН.*

Мал. Г. Вальк.




**ГІТЛЕР: — Я на Дон і ён за мной, я на Днепр і ён за мной. Няўжо аж да Берліна ён будзе мяне праследваць?**

## КАРОТКІЯ ЖАРТЫ

### КАНЕЦ ЯСНЫ

— Фрыц! У цябе яшчэ захаваўся партсігар?

— Захаваўся. А што?

— Аддай яго мне. Ты ўсёроўна ў атаку ідзеш...

### НЕ ЎСЕ ДОМА

— Ты ведаеш, гэты Ганс якісьці дзіўны. Па-мойму у яго «не ўсе дома»!

— Гэта праўда. Пасля паветранай бамбардыроўкі Эссена ад яго дома нават каменя не засталося...

### У БЕРЛІНСКАЙ ШКОЛЕ

— Зноў, вы, Швейдэр, адказваеце неўпапад. Калі вы навучыцеся думаць?

— Гэта зусім не трэба, герр настаўнік. Праз тыдзень за мяне будзе думаць фюрэр—мяне прызываюць у армію.

### У НЯМЕЦКІМ ШПІТАЛІ

— Герр оберст, за адвагу ў барацьбе з партызанамі, фюрар узнагародзіў вас жалезным крыжам. Віншую! Цісну руку!

— Дзякуй вам, пан генерал. На жаль, магу падаць вам толькі нагу—рукі мне ў Беларусі партызаны адцяпалі.

### СТАРОЕ І НОВАЕ

— Ну, Карл, што ў вас новага пасля бою?

— Усё новае.

— Як так?

— І камандзір новы, і салдаты новыя— пасля бою ўзамен забітых прыслалі.

— І нікога са старых?

— Не, старых многа.

— Як гэта?

— Ды ўсе прыбыўшыя не маладзей шасцідзесяці год.

### РАЗМОВА Ў НЯМЕЦКІМ АКОПЕ

— Ці ўпэўнен ты, што зараз у Берліне які-небудзь румын не абдымае тваю жонку?

— Упэўнен.

— Чаму?

— Учора я даведаўся, што не разарвала на кавалкі англійская бомба.

# АДНОЛЬКАВЫ ЛЁС

У Балтыйскім моры наносіць ворагу магутныя ўдары савецкі крэйсер «Мінск».

Мал. Г. Валька.




**Фрыц:** — Пасля таго, як мой брат загінуў у Беларусі, я пакляўся, што не паеду туды. Але, відаць, так ужо суджана мне—загінуць пад Мінскам.

# АДПЛАТА

Па сяле разнеслася чутка аб наступленні Чырвонай Арміі. Сяляне, уведаўшы навіну, ажылі, павесялелі. Сустракаючыся, яны перакідваліся радасным позіркам, радасным словам.

І толькі адзін чалавек у сяле ў гэты дзень стаў панурым, асунуўся і з выглядам спалоханай вароны стаў прыслухоўвацца да ўсяго. Гэта быў староста Дурыла. Ён сабачым нюхам улавіў штосьці нядобрае і хацеў даведацца, аб чым гавораць сяляне, але ў яго прысутнасці людзі маўчалі.

Дурылу паказалася ўсё гэта занадта падазроным. «Ці не даведаліся сяляне»,— падумаў ён, — па чыйму даносу немцы павесілі Міколу Куньку за сувязь з партызанамі?»..

Каваля Міколу Куньку выдаў немцам Дурыла. Зрабіў ён гэта так спрытна, як яму здавалася, што здагадацца аб тым, што гэта справа яго рук, было немагчыма. Цяпер-жа паводзіны людзей наводзілі яго на сумныя думкі

Ноччу ён раптам прачынаўся. Дрыжачы ўсім целам, ён на цыпачках падыходзіў да акна і доўга прыслухоўваўся да завывання ветру.

Часта Дурыла сніў нядобрыя сны. Ускочыўшы з пасцелі, ён неспакойна ўслухоўваўся ў магутны храп сваёй шасціпудовай жонкі.

— Марыля! — будзіў ён яе.

Але Марылю разбудзіць было не так лёгка. Бяссувязна пралепятаўшы штосьці ў сне, яна пераварочвалася на другі бок і прадаўжала храпці.

У бязсувязным лепеце жонкі ён аднойчы ўлавіў адно слова, ад якога аж закалаціўся.

— Павесяць...—сказала яна.

— Каго павесяць?—ціха спытаў ён, вылупіўшы ад жаху вочы.

Не атрымаўшы адказу, ён падскочыў да жонкі, схапіў яе за плечы і закрычаў

Жонка доўга маргала маленькімі заплыўшымі вачамі і ўсё-ж не ведала, што адказаць.

— Прытвараешся?—сярдзіта крыкнуў ён,—сука! Каго павесяць?

Марыля спалохана перахрысцілася.

— Успамінаю,—адказала яна, — мне снілася, што мы закалолі свінню...

— Не веру!—адштурхнуў ён жонку.— Ты таксама, як і ўсе, штосці ўтойваеш...

Дурыла хутка апрануўся, накінуў на сябе кажух і выбег з дому. Ён падкрадваўся да сялянскіх хат і напружваючы слых, стараўся ўлавіць хоць адно слова. Але людзі спалі, не падазраваючы, што іх пільнуе пад вокнамі староста Дурыла.

А ён, сутулячыся і прыгібаючыся, ценню прабягаў ад адной хаты да другой, спыняўся пад вокнамі і прыслухоўваўся да людскога храпу.

Наблізіўшыся да ўскраіны сяла, Дурыла спыніўся, як укопаны, і некаторы час глядзеў прыплюшчаным позіркам, як бы імкнучыся зразумець, куды ён забрыў. Перад ім стаяла вісельня. На ёй вісеў чалавек.

Дурыла адчуў, як халодны пот выступіў у яго на лбе. Перад ім вісеў Мікола Кунько і дошчачка матлялася на яго грудзях з надпісам: «Партызан».

— Божа!—падумаў Дурыла. — Каваль усё яшчэ вісіць... Зняць яго трэба... зняць... Няхай людзі забудуць аб ім, нібы і не было зусім Міколы Кунько на свеце...

Дурыла пастукаў у акно бліжэйшай хаты. Там жыў бондар з сям'ёй. Староста загадаў мужчынам хутка апрануцца і выйсці на вуліцу. І калі на ганку з'явіліся бацька і сын, Дурыла ім загадаў неадкладна зняць павешанага

Бондар і яго шаснаццацігадовы сын ахвотна споўнілі загад. Сяляне яшчэ дзень таму назад хацелі зняць з вісельні каваля, але немцы забаранілі здымаць павешанага на працягу пяці дзён.

Як толькі яны знялі і палажылі цела каваля на зямлю, бондар спалохана спытаў:

— Пане Дурыла, а калі немцы даведаюцца?..

— Ніхто нічога не даведаецца,—адказаў староста.—Ні аднаго немца ў вёсцы няма...

— Дык можа хто з паліцэйскіх?—спытаў бондар.

— Ніводнай душы! — адказаў Дурыла.—Адзін я тут гаспадар!

— Ясна!—адказаў бондар.

Ён мігнуў сыну і абодва нечакана накінуліся на старасту.

Скруціўшы рукі і заткнуўшы яму рот анучай, бондар сказаў:

— Не патрэбны нам такія гаспадары!

І яны тут-жа павесілі старасту.

Л. МІНСКІ.


15-II—44 г. Заказ № 317 Адказны рэдактар КАНДРАТ КРАПІВА.

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ гадзіну

Газета-плакат, выданне ЦК КП(б) Беларусі

№ 121 | Люты 1944 г. | Цана 30 кап.


**Няхай жыве пабеданосная Чырвоная Армія, якая гераічна змагаецца за чэсць, свабоду і незалежнасць нашай Айчыны супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў!**

З заклікаў ЦК ВКП(б) к 26-ай гадавіне Чырвонай Арміі.

Мал. Г. Валька.




## ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Змучаны смуткам па роднай краіне,
Вестак чакаючы з мілых мясцін,
Горкімі днямі, як радасць пакіне
І застануся з тугой на адзін,—

Думкай трывожнай і сэрцам
збалелым
Зноў у цябе я шукаю надзей,
Армія волатаў, армія смелых,
Армія мужных совецкіх людзей.

Быццам чытаю бяссмертную кнігу,
Успамінаю паходы твае;
Смутак знікае, і ў сэрцы паціху
Сонца усходзіць і дзень настае.

Веру: узнятая сталінскай воляй,
Загартаваная ў грозных баях,
Ты не пакінеш мой край у няволі,
Ты развінеш над пакутнымі сцяг.

Час перамогі цяпер недалёка,
Марна трывожныя думкі былі:
Ты ўжо ступаеш вялікасным крокам
Па беларускай любімай зямлі.

Шырыцца сіла твая баявая,
Множыцца веліч паходаў былых,
Слава Катоўскага, слава Чапая,
Слава сучасных герояў тваіх.

Не, не загіне на свеце ніколі
Воля і шчасце бацькоў і сыноў:
Заўжды за праўду на ратнае поле
Выйдзе Чырвоная Армія зноў!

**Пятро ГЛЕБКА.**

# КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

## АДНА ТАМ, АДРУГАЯ ТУТ

Апошні сынок фрау Муфке, чырвонашчокі Ганс, быў прызван у армію на татальнай мабілізацыі і адразу-ж адпраўлен на рускі фронт. Успамінаючы сваіх загінуўшых старшых сыноў і развітваючыся з Гансам, фрау доўга плакала, а перад самым адыходам поезда сказала:

— Ты Ганс, не цырымонься з гэтымі рускімі. Ты іх—раз, два—і гатова! Ды хутчэй вяртайся, каб адна нага тут, а другая—там.

— Добра, мама,—сказаў ваяўнічы сын, не маючы ніякіх пачуццяў пры развітанні.

Два тыдні няўцешна плакала фрау Муфке, нічога не ела, не піла і была ў поўным адчаі. На пятнаццаты дзень увечары, праз дзесяць хвілін пасля прыбыцця цягніка з усходу, ў калідоры пачуўся знаёмы стук. Фрау хутка ўскочыла і пабегла адчыняць дзверы. І сапраўды перад ёю стаяў сын.

— Ганс! — радасна ўсклікнула яна,—так хутка?

— О, так, мама,—сказаў сын.—Я выканаў твой наказ: адна нага тут, а другая — там, на рускім фронце. Ты бачыш?

І тут толькі фрау Мюфке разгледзела пад пахамі Ганса белыя драўляныя кастылі.

## ХАЛОДНЫ ПРАМОУЦА

Старому нямецкаму генералу, які прыбыў з усходняга фронта, Гітлер з Гебельсам даручылі выступіць і расказаць берлінскім абывацелям пра становішча на фронце. Генерал гаварыў нудна гадзіны паўтары пра эластычную абарону немцаў, пра ўмелае адступленне фашысцкіх войск з совецкай зямлі.

Белакурая Грэтхен, якая сядзела побач са сваім інвалідам-мужам, спытала:

— Скажы, Франц, чаму гэта генерал аб усім так холадна расказвае? Можна падумаць, што ў яго душы няма.

— Гэта праўда, Грэтхен,—сказаў Франц.—У адной з бітв з рускімі яго душа перасялілася ў пяткі.

— Ну і што-ж? Дык цяпер ён не на фронце, няхай выцягне яе з пятак на сваё месца.

— Гэтага ён не можа зрабіць.

— Але чаму?

— Да таму, што пяткі яго засталіся на рускім фронце.

**В. БЯЛЯЕЎ.**

## ЯК ЎКАРОЧВАЛІ ФРЫЦА

Мал. Г. Валька.




Наступаў упарта, доўга —
Вось яна, нарэшце — Волга!
Глянуў фрыц на берагі,
І... папплёўся без нагі.

На Дану мы фрыца білі,—
На другую ўкарацілі.




Быў яшчэ ўкарочан гад
На Дняпры — па самы зад.

Покуль фрыц дапрэ да Шпрэ,
Дык і костак не збярэ.




Не змаўкае гул гармат
А-ні ўночы, а-ні ўдзень:
Да бацькоўскіх нашых хат
Наша армія ідзе.

Коні скачуць на рысях,
Чуцен цокат капытоў.
Палымнее ярка сцяг
Вышай велічных бароў.

Кожны куст і кожны яр,—
Чужаніцам дай удар!
Каб ад немцаў-чужакоў—
Леглі косці між кустоў.

Камендант і паліцай
Ціха ехалі праз гай.
Партызаны — тут, як тут,—
Стаў абодвум ім капут.

Партызаны далі бой
Лютым фрыцам раніцой.
Многа немцаў за Дзвіной
Вечны свой знайшлі спакой.

Ой, іграй, іграй, баян,
Пра адвагу партызан,
Пра іх сцежкі у гаях,
Пра іх мужнасць у баях.

Быў ён слаўны брыгадзір
У калгасе «Першамай»,
Зараз храбры камандзір—
Вызваляе родны край.

Многа вёрст, праз многа сёл
Вёў наперад нас камбат:
Немца ўзялі мы ў «кацёл»—
Ні наперад, ні назад.

Строчыць часта кулямёт,
Не змаўкае над Дзвіной,
Косіць, нішчыць люты зброд,
Прагу поіць іх крывёй.

Чуцен нашых гул гармат
І працяглы посвіст мін:
Перабілі немцаў шмат,
Прысылай другіх, Берлін.

Рокат чуецца з высот ,
І матора тонкі спеў:
То совецкі наш пілот
Біць чужынцаў паляцеў.

Гул праслаўленых «кацюш»
Між палеткаў, між лясоў
Вымятае многа душ
З лютых немцаў-чужакоў.


Б—8061 Заказ 494 Адказны рэдактар Кандрат КРАПІВА.